ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 10 (911) | Серада, 12 чэрвеня 1996г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

**На савеце універсітэта**

## СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

30 мая на Савеце нашага універсітэта ў 18-ы раз адбыліся навуковыя чытанні пераможцаў конкурсу на лепшыя навукова-даследчыя працы 1996 года. Пасля прысваення ў 1988 г. ГДУ імя першага беларускага друкара, выдатнага вучонага і асветніка, яны называюцца Скарынаўскімі. Сёлета іх лаўрэатамі сталі доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін В.В.Валетаў, доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугін, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры оптыкі В.П.Зялёны, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры матэматычнага аналізу А.П.Старавойтаў. Іх навуковыя даклады былі прысвечаны адпаведна важнейшым праблемам біялогіі, медыцыны, оптыкі і матэматыкі.

Лаўрэаты Скарынаўскіх навуковых чытанняў удастоены памятных дыпломаў і грашовых прэмій, якія ва ўрачыстай абстаноўцы з цёплымі віншавальнымі словамі ўручыў рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

## СПРАВАЗДАЧА ДЭКАНА

З ёй выступіў кіраўнік факультэта прафарыентацыі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ дацэнт А.У. Гаўрылюк. Ён падрабязна расказаў аб рабоце ўзначальваемага ім структурнага падраздзялення, указаў на станоўчае ў дзейнасці факультэта, адзначыў маючыя месца недахопы.

## АБ ВЫКАНАННІ КАЛЕКТЫЎНАГА ДАГАВОРА

Па гэтаму пытанню заслуханы інфармацыі старшынь прафкомаў: выкладчыкаў і супрацоўнікаў -- Г.І.Варатніцкага, студэнтаў -- Н.І.Колтышавай. Адзначана, што ў цэлым пункты калектыўнага дагавора выконваюцца. Але ёсць і такія, якія па розных прычынах не выршаюцца.

Асаблівая ўвага звернута на ўмацаванне працоўнай і вучэбнай дысцыпліны. Як высветлілі праведзеныя ў апошні час праверкі, яна ў многіх падраздзяленнях і на некаторых факультэтах застаецца на нізкім узроўні. Таму пры прафкоме створана спецыяльная камісія, якая сумесна з аддзелам кадраў і вучэбным аддзелам будзе рэгулярна кантраляваць захаванне працоўнага і вучэбнага рэжыму.

## АБРАНЫ ЗАГАДЧЫКАМІ КАФЕДР

На конкурснай аснове Савет абраў на вакантныя пасады загадчыкамі кафедр: лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- Каняхіна Міхаіла Васільевіча, фізіялогіі чалавека і жывёлін -- Карпенку Аляксея Фёдаравіча, тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- Кошмана Міхаіла Рыгоравіча.

## ЯШЧЭ АДЗІН СОРАСАЎСКІ ДАЦЭНТ

У наш універсітэт прыйшла прыемная вестка. Сярод яго вучоных прыбавілася яшчэ на аднаго сорасаўскага дацэнта. Лаўрэатам ганаровага гранта стаў дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі кандыдат фізіка-матэматычных навук В.М.Капшай.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь за №264-XIII за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, значны асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў трое вучоных нашай краіны ўзнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Сярод іх -- прафесар кафедры беларускай мовы нашага універсітэта Уладзімір Васільевіч Анічэнка.*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты ГДУ горача віншуюць Уладзіміра Васільевіча з вышэйшай узнагародай Рэспублікі Беларусь і жадаюць яму новых поспехаў у навуковай і педагагічнай дзейнасці.*

*Ганаровую грамату У.В.Анічэнку ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь уручыў на Савеце універсітэта рэктар Л.А.Шамяткоў.*

## ВІНШУЕМ!

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры беларускай літаратуры МАМАЧКІНА Дзмітрыя Леанідавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.***

***

***На майскім пасяджэнні Атэстацыйная калегія Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь прысвоіла вучонае званне дацэнт кандыдатам навук загадчыку кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін КАРПЕНКУ Аляксею Фёдаравічу, КАЛАЦЭЙ Святлане Мікалаеўне з кафедры французскай мовы, СЕЛЬКІНАЙ Людміле Антонаўне з кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, ЦІТОВІЧУ Анатолю Антонавічу з кафедры эканомікі і сацыялогіі працы.***

## СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ

Беларускі Фонд Сораса аб"явіў пераможцаў конкурсу праектаў правядзення выстаў, семінараў, конкурсаў і фестываляў у рамках "Маладзёжнай праграмы". Званне лепшых аспрэчвалі 32 праекты. 17 з іх прызнаны пераможцамі. Сярод іх -- праект культурнага цэнтра нашага універсітэта "Правядзенне Міжнароднага маладзёжнага фестывалю ў Гомельскай вобласці "Арт-сесія".

Агульная сума фінансавай падтрымкі, якая выдзелена праектам-пераможцам, складае 15 тыс. долараў ЗША.

Беларускі Фонд Сораса сардэчна павіншаваў пераможцаў праектаў "Маладзёжнай праграмы" і паведаміў, што чарговы прыём заявак на гэты конкурс заканчваецца 1-га кастрычніка 1996 года.

# БЫВАЙ, УНІВЕРСІТЭТ!

Гэтыя словы хутка скажуць выпускнікі дзённай формы навучання ГДУ. Што чакае іх наперадзе, пасля заканчэння універсітэта, дзе прайшлі іх лепшыя гады жыцця? Канешне, яны звязваюць свае надзеі, спадзяванні з работай па той спецыяльнасці, якую атрымалі за гады вучобы. Іх мара стаць філолагам ці юрыстам, эканамістам ці геолагам, ажыццявілася. Але ці змогуць маладыя спецыялісты з дыпломам аб вышэйшай адукацыі рэалізаваць свае веды на практыцы? На вялікі жаль, далёка не ўсе. Сённяшняе жыццё прыносіць нам шмат праблем, у ліку якіх і беспрацоўе, выкліканае складаным эканамічным становішчам у нашай краіне. І сярод тых, хто застаецца без работы па спецыяльнасці, будуць і нашы выпускнікі. Гэта было відавочна яшчэ пры размеркаванні пяцікурснікаў, якое адбылося ў красавіку. "Шукайце работу самі" -- гэтыя словы гучалі тады вельмі часта ад членаў размеркавальнай камісіі, асабліва ў адрас выпускнікоў вытворчых спецыяльнасцей. Гарантаваных дзяржавай працоўных месц для іх амаль не было. Адмовіліся браць на працу сваіх студэнтаў, якіх яны накіроўвалі на вучобу і плацілі ім стыпендыю, многія прадпрыемствы і арганізацыі.



Сёлетні выпуск маладых спецыялістаў, якія прыйдуць працаваць у праваахоўныя органы горада і вобласці, стане гістарычным для нашага універсітэта, бо ён з'яўляецца першым з дня адкрыцця ў ГДУ юрыдычнага аддзялення.

**На здымку:/злева направа/ С.Аземша, Л.Ляцяга, Л.Субоціна, А.Снапок, А.Ермалаеў і А.Усціновіч, якія на "выдатна" прайшлі пераддыпломную практыку, чым даказалі, што змогуць гэтак жа добра зарэкамендаваць сябе і ў час самастойнай працы.**

**Фота М.Бяльковіча.**

Нямала маладых людзей апынулася на раздарожжы. Некаторыя скарыліся, як кажуць, лёсу, іншыя спрабавалі выйсці са складанага становішча самастойна -- шукалі сабе месцы ў камерцыйных і прыватных фірмах і г.д. І не беспаспяхова.

Патрэба ў педагогах, якіх у асноўным рыхтуе наш універсітэт, на Гомельшчыне застаецца. Тут праблем менш, чым з выпускнікамі вытворчых спецыяльнасцей. Але ж настаўнікаў не хапае пераважна ў вясковых школах, куды маладыя спецыялісты ехаць не асабліва жадаюць. Яны лічаць за лепшае застацца ў Гомелі і шукаюць работу самастойна. Праўда, некаторыя больш удумліва і разважліва ацэньвалі сітуацыю і давалі згоду паехаць працаваць у школы глыбінкі.

Пэўная колькасць выпускнікоў сёлетняга года ўсё ж будзе вымушана стаяць на ўліку на "біржы працы". Начальнік аддзела праблем занятасці і рынку працы гарадскога цэнтра занятасці насельніцтва А.І.Зямлянік, якая прысутнічала сёлета на размеркаванні пяцікурснікаў ГДУ, адзначыла, што за апошні час сітуацыя з беспрацоўем значна пагоршылася. Так, па стану на 1 сакавіка г.г. у цэнтры на ўліку знаходзілася 6.300 беспрацоўных: з іх моладзі ад 16 да 25 гадоў -- 45%, ад 16 да 30 -- амаль 60%. Такое становішча не можа не трывожыць , таму спецыялістамі цэнтра занятасці плануецца стварэнне сектара па рабоце з моладдзю, каб пасля спецыяльнага тэсціравання дапамагчы ёй лепш з"арыентавацца, прайсці перанавучанне і атрымаць работу.

...Пакуль жа ў выпускнікоў клопаты іншага, больш прыемнага характару: фатаграфаванне на памяць з сябрамі, аднакурснікамі, урачыстае атрыманне дыпломаў. І яны будуць памятаць сваіх выкладчыкаў, універсітэт, як і стаў ім за студэнцкія гады родным і блізкім. Як бы там ні было цяжка ў далейшым самастойным жыцці, аб ГДУ яны будуць успамінаць з удзячнасцю.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

*Ваша здароўе*

## І КАРЫСНА, І ЦІКАВА

Вось ужо другі год у нашым універсітэце праводзяцца заняткі ў групе аматараў кітайскай гімнастыкі тайцьзі цюань. Гэта адзін з напрамкаў аздараўленчай гімнастыкі ушу. Ёй займаюцца выкладчыкі і супрацоўнікі, прывіў любоў да якой і навучыў яе элементам вядомы ў Кітаі майстар ушу дацэнт Пекінскага педагагічнага універсітэта Бань Уці. Ён прыязджаў у наш універсітэт і чытаў лекцыі на геолага-геаграфічным факультэце.

На занятках, якія праходзяць у спартыўнай зале кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры, спасцігаецца практыка, у якой на дзіва арганічна спалучаюцца методыка аздараўлення, эстэтызм цялеснай пластыкі і псіхалагічнае ўдасканаленне. У план заняткаў уключаны таксама некаторыя практыкаванні самамасажу асобных частак цела, элементы сустаўнай гімнастыкі, стрэтчынга і аўтатэрапіі.

Варта адзначыць, што сучаснаму чалавеку, які падвяргаецца сацыяльным стрэсам, гіпакенізіі, для захавання працаздольнасці неабходна ўключаць у распарадак дня метады і спосабы псіхафізічнай разрадкі. Для тых, хто займаецца ў гэтай групе, такім метадам і з"яўляецца гімнастыка тайцьзі цюань.

Хочацца выказаць шчырую ўдзячнасць рэктарату, прафкому выкладчыкаў і супрацоўнікаў, яго старшыні Г.І.Варатніцкаму, загадчыкам кафедр фізвыхавання і АЛФК В.А. Калядзе і Г.І. Нарскіну, супрацоўнікам кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры за дапамогу ў арганізацыі і правядзенні гэтых цікавых і карысных для здароўя чалавека заняткаў.

**А.МАКСІМЕНКА,**
**ст.навуковы**
**супрацоўнік НДС.**



# ЯК РЫХТУЮЦЬ БІЗНЕСМЕНАЎ У АНГЛІІ?

Нядаўна ў рамках міжнароднай праграмы "ТЭМПУС" ГДУ наведаў дэкан факультэта бізнесу і маркетынга універсітэта Цэнтральнай Англіі (адзін з трох універсітэтаў, размешчаных у г.Бірмінгеме) прафесар Філ Кларк. Ён сустракаўся са студэнтамі, выкладчыкамі эканамічнага факультэта, работнікамі вучэбнага, планава-фінансавага аддзелаў, бухгалтэрыі, іншых структурных падраздзяленняў ГДУ. Прафесар пазнаёміў іх са структурай падрыхтоўкі студэнтаў ва універсітэце, дзе ён працуе.

Факультэт, які ён узначальвае, прымае на вучобу 5 тысяч чалавек (усяго ва універсітэце 25 тысяч студэнтаў). Маладыя людзі вучацца тут 3 гады, пасля чаго атрымліваюць ступень бакалаўра. Іх прыём на вучобу ажыццяўляецца на падставе пададзенай імі заявы і з улікам адзнак, атрыманых у школе. Уступных экзаменаў, як у нас, там няма. Проста кожны малады чалавек рэальна ацэньвае свае магчымасці і выбірае факультэт па здольнасцях. Адукацыя -- бясплатная. Студэнт плаціць толькі за інтэрнат і харчаванне. Ёсць таксама катэгорыя студэнтаў, якіх у нас называюць завочнікамі. Яны займаюцца некалькі разоў на тыдзень па вечарах, сваё навучанне аплачваюць або самі, або гэта робяць іх прадпрымальнікі, якія паслалі іх на вучобу. Існуе яшчэ і такая форма вучобы -- у крэдыт: малады чалавек бярэ грашовую пазыку, потым на працягу некалькіх гадоў яе выплачвае.

Стыпендыя ў студэнтаў дзённай формы навучання -- невялікая, таму многія з іх у вольны ад вучобы час працуюць у супермаркетах, кафэ і г.д.

5 тысяч студэнтаў навучае 171 выкладчык, 60 адзінак -- адміністрацыйнага персаналу. У тыдзень выкладчык працуе 37 гадзін. З іх 15 -- адводзіцца непасрэдна на лекцыі, астатнія -- на праверку курсавых работ, даследаванні, прыем экзаменаў, распрацоўку новых курсаў і інш. Ёсць абавязковыя вучэбныя курсы і факультатыўныя. Апошнія студэнты могуць наведваць па жаданню. Вучэбных планаў зверху выкладчыкам не навязваюць.

На апошнім курсе вучобы студэнты праходзяць вытворчую практыку ў малым бізнесе. Прадпрымальнік ацэньвае іх работу, і калі яму падабаюцца дзелавыя якасці студэнта, пасля заканчэння вучобы ён запрашае яго да сябе на працу. Каб атрымаць дыплом бакалаўра, студэнтам неабходна здаць дзесяць модуляў (прадметаў). Не абавязкова гэта павінны быць адны экзамены. Ёсць, напрыклад, модулі, якія патрабуюць распрацоўкі нейкага пректа або выканання пісьмовага задання.



Філ Кларк даў адказы на шматлікія зададзеныя яму пытанні, адзначыўшы пры гэтым, што яму спадабаліся студэнты эканамічнага факультэта ГДУ сваёй добрай прафесійнай падрыхтоўкай. У сваю чаргу англійскаму госцю было падрабязна расказана аб нашым універсітэце. А калі размова зайшла аб тым, што на адукацыю ў нашай краіне дзяржавай выдзяляецца недастаткова матэрыяльных сродкаў, ён адзначыў такую дэталь: рэктары навучальных устаноў Англіі пры неабходнасці могуць уплываць на ўрадавыя структуры і пераканаць іх змяніць у лепшы бок свае адносіны да адукацыі.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку:** англійскі госць Філ Кларк.

**Фота У.Чысціка.**



Сёлета кафедра "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" выпускае 27 маладых спецыялістаў. Сферай прымянення іх ведаў можа быць любая галіна, у якой нельга абысціся без сучаснай камп"ютэрнай тэхнікі. Таму праблем з працаўладкаваннем у такіх спецыялістаў няма. Сярод гэтых выпускнікоў 9 чалавек атрымаюць дыпломы з адзнакай. Андрэй Варуеў, Уладзімір Кулінчанка будуць працягваць вучобу ў аспірантуры пры кафедры АСАІ.

За 15 гадоў свайго існавання склаўся калектыў кафедры, умацавалася яе матэрыяльная база. І цяпер можна сцвярджаць, што яна адна з лепшых ва універсітэце. Толькі за апошнія два гады тут набыта (не без дапамогі шматлікіх спонсараў) на 300 млн. рублёў сучаснай тэхнікі, арганізаваны і дзейнічаюць камп"ютэрны клас для падрыхтоўкі выкладчыкаў, які працуе і па міжнароднай праграме "ТЭМПУС", і клас для студэнтаў, у якім яны могуць займацца не толькі ў вучэбны час, ёсць лабараторыя для дыягностыкі і ўхілення няспраўнасцей ў камп"ютэрнай тэхніцы.

Удасканальваецца не толькі матэрыяльная база кафедры, расце і яе навуковы, педагагічны патэнцыял. Так, напрыклад, асістэнт А.Паташэнка зараз павышае ўзровень сваёй кваліфікацыі ў Вышэйшай тэхнічнай школе г.Кіля ў Германіі, з якой наш універсітэт мае цесныя сувязі па праграмме "ТЭМПУС".

Будзе ўведзена ў дзеянне лакальная вылічальная сетка, якая аб"ядноўвае ўсе вучэбныя камп"ютэры кафедры. Яе ў знак вялікай удзячнасці і на памяць аб сабе калектыву кафедры набылі за сваю студэнцкую стыпендыю сёлетнія выпускнікі, якіх вы бачыце на здымку.

**Фота У.Чысціка.**

# ПРАБЛЕМЫ ВУЧЭБНАЙ ПРАКТЫКІ

Дзесяць гадоў назад на геалагічным факультэце ўпершыню была арганізавана вучэбная практыка па методыцы гідрагеалагічных і інжынерна-геалагічных даследаванняў.

Да гэтага часу ўжо быў створаны вучэбны геалагічны палігон у Чонках. Біёлагі асаблівага задавальнення ад нашай прысутнасці на іх тэрыторыі не адчувалі: яны вучаць студэнтаў ахоўваць кожны куст, кожную расліну, а тут прыязджае свідравальная ўстаноўка, прывозяць трубы даўжынёй па 12 м, разбураюць клумбы з кветкамі... На вашага пакорлівага слугу яны пісалі штогод па дзве дакладныя, зразумела, без прапановы вынесці яму падзяку. Цяпер Чонкаўскі палігон поўнасцю належыць геолагам, але ён стаў бездаглядным -- няма абслугоўваючага персаналу, ніхто не адказвае за 25 свідравін, дачнікі вымаюць трубы. А падобны палігон Маскоўскага універсітэта абслугоўваюць 17 інжынераў і майстроў круглагадова.

Потым былі створаны яшчэ два палігоны -- на Гомельскім хімзаводзе і Барсукоўскім нафтавым месцанараджэнні. На трох палігонах (два з іх -- экалагічныя) ёсць 115 свідравін глыбінёй ад 3-6 метраў да 60-350 м. Усе яны зроблены за кошт гаспдагаворных прац дацэнтаў В.Г. Жоглы і аўтара гэтага артыкула пры мінімальным укладзе дзяржбюджэтных асігнаванняў.

У папярэднія гады вучэбную практыку абслугоўвалі аўтобусы аўтапаркаў Гомеля і Рэчыцы -- універсітэт заказваў аўтобус на 13-16 маршрутаў. У гэты ж юбілейны год у нас будзе толькі адзін аўтамабільны маршрут (на Барсукоўскае нафтавае месцанараджэнне), і той за кошт спонсара -- інстытута БелНДПІнафта. Зусім відавочна, што мы страчваем пазіцыі. Не хапае самага неабходнага -- рыштунку, інвентару, прыборы ўжо старыя. Мне здаецца, што ў той момант, калі я пішу гэты артыкул, другі дацэнт піша на мяне дакладную: Журавель зрывае яго практыку, забраў ... абедзве рыдлёўкі. І гэта не жарт. Так было год назад.

Адзначаючы юбілей практыкі, хачу заўважыць, што кіраўнікі студэнцкіх брыгад А.Ф.Акулевіч, А.Н.Галкін і я прыкладаем намаганні, каб не было сорамна перад студэнтамі за нашу універсітэцкую галечу. Выкручваемся, як можам. Праграму практыкі выканаем, нягледзячы на неюбілейны настрой.

**М.ЖУРАВЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры геалогіі і карысных выкапняў.**

◆◆◆



**Вось так замацоўваюцца тэарэтычныя веды.**

**Фота У.Чысціка.**

# ВАНДРОЎКА НА ПАЛЕССЕ

***Студэнцкія гады, кажуць, самыя лепшыя ў жыцці. Бадай, з гэтым нельга не пагадзіцца. Таму, калі выпадае магчымасць выбрацца ўсёй грамадою за межы роднай альма-матэр, мы з радасцю яе выкарыстоўваем. На гэты раз дарога вяла нас, студэнтаў-філолагаў, на Палессе, на радзіму Івана Паўлавіча Мележа.***

Дзіўна было раптам апынуцца ў тых самых мясцінах, дзе жыў і пісаў свае творы пісьменнік, і паспрабаваць далучыцца да вытокаў яго таленту. Мушу прызнацца, што ўсе з заміраннем сэрца чакалі сустрэчы з той самай грушай-дзічкай, ля якой кахаліся Васіль і Ганна, хацелася пабачыць грэблю, у якую было ўкладзена столькі працы, і востраў сярод балота, так прыгожа апеты Мележам.

І таму першы наш прыпынак -- вёска Курані. Але наша радасць і захапленне ад сустрэчы з гэтай мясцінай мела вельмі горкі прысмак. Курані напаткаў лёс многіх іншых вёсак і мястэчак беларускага ды украінскага Палесся: яны апынуліся ў зоне адсялення пасля чарнобыльскай аварыі. Вось і засталіся тут, дзе раней кіпела і бурліла жыццё, паўразбураныя хаты ды некалькі старых людзей, што корпаюцца на сваіх градках. І няўцям ім, што зямля гэта, якая ўсё жыццё іх карміла, гадавала, нічога цяпер, апроч смерці, даць не можа.

А наступны наш прыпынак -- вёска Глінішчы. Мы завіталі ў дом-музей І.П. Мележа, які створаны рукамі жыхароў вёскі, дзе вучыўся будучы пісьменнік.

З нейкім своеасаблівым пачуццём уваходзілі мы ў "святая святых" -- яго творчы кабінет. Менавіта тут ствараў Іван Паўлавіч свае неўміручыя творы пра палешукоў.

*Пішу без лямпы за сваім сталом,*
*А будзе так навекі;*
*Што мы -- і палешукі,*
*і чалавекі.*
(І.П.Мележ)

**В.ЧЭКАН,**
**студэнтка 3-га курса філалагічнага факультэта.**



# "ВЕЧНЫ СЮЖЭТ" -- НА ГОМЕЛЬСКАЙ СЦЭНЕ

*Трышчан: Наша каханне цяжка будзе ўтаіць, і яно прывядзе ўсіх нас да пагібелі.*
*Іжота: Я буду кахаць цябе і пасля смерці.*

У Гомельскім абласным драматычным тэатры прайшоў міжнародны фестываль пад назвай "Славянскія тэатральныя сустрэчы", у якім прымалі ўдзел тэатральныя калектывы Беларусі, Украіны і Расіі: Мазырскі драматычны тэатр імя І.Мележа, Дзяржаўны тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна" (г.Мінск), Гомельскі незалежны тэатр, Бранскі тэатр драмы, Гомельскі абласны тэатр лялек, Чарнігаўскі музычна-драматычны тэатр імя Т.Р.Шаўчэнкі, Гомельскі абласны драматычны тэатр і Жытомірскі дзяржаўны музычна-драматычны тэатр імя І.Качэргі. На працягу пяці дзён гамяльчане і госці нашага горада мелі магчымасць пазнаёміцца з творчымі калектывамі гэтых тэатраў, убачыць цудоўныя пастаноўкі і проста прыемна правесці свой час, забыўшыся на ўсе праблемы, у вельмі цёплай, амаль сяброўскай атмасферы.

Першым спектаклем, якім адкрываўся фестываль, была камедыя "Трышчан і Іжота", пастаўленая Мазырскім драматычным тэатрам імя І.Мележа па п"есе "Трышчан, або блазны на пахаванні" сучаснага беларускага драматурга Сяргея Кавалёва (да ведама цікаўных студэнтаў: кожны зможа пазнаёміцца з ёй, калі разгарне другі выпуск зборніка "Беларуская драматургія" на старонцы 53).

Назва камедыі кажа сама за сябе. П"еса напісана паводле матываў старажытнабеларускага рыцарскага рамана XVI ст., які і сёння прыцягвае ўвагу перакладчыкаў, празаікаў, драматургаў і паэтаў, цікавасць да якога не толькі не зменшылася, але, наадварот, неяк асабліва ўзрасла ў апошнія гады.

Яшчэ Максім Багдановіч параўноўваў гэты твор з "Іерыхонскай ружай". Так, у сваім артыкуле "Роман Тристана и Изольды в изложении Ж.Бедье" ён пісаў: "Есть странный цветок, называемый "Иерихонская роза". Высушенный, поблекший, он все же оживает едва только коснется воды. Такова и книга, отмеченная нами в предыдущих строках: свежестью веет от ее тысячелетних фраз, вновь коснувшихся читательской души". І гэта сапраўды так. Раман пра каханне Трышчана і Іжоты -- вечны раман, бо вечная яго асноўная тэма. М.Багдановіч заначае: "Говорит она (книга) о страстной, преданной, неотвратимой и в этой неотвратимости трагической любви, формы которой -- изменчивы, но сущность -- вечна и неизменна". Тэма кахання ў творы натхняла пісьменнікаў Вальтэра Скота, Лесю Украінку, Томаса Мана, кампазітара Рыхарда Вагнера, іншых майстроў літаратуры і мастацтваў. На сучасную беларускую мову" "Аповесць пра Трышчана" пераклаў М.Раманоўскі. Гэта штотычыцца ролі і лёсу старажытнабеларускага рыцарскага рамана ў гісторыі беларускай літаратуры.



У дні "Арт-сесіі. Гомель-96"

У адзін з дзён фестывалю гледачы, сярод якіх былі і студэнты філалагічнага факультэта, мелі магчымасць убачыць на сцэне гісторыю трагічнага кахання Трышчана і Іжоты, перанесціся ў эпоху рыцарства, такую заманлівую і недасягальную, далучыцца да перажыванняў галоўных герояў, у пэўнай ступені падзяліць іх светлае, высокае пачуццё". Нягледзячы на тое, што ў камедыі толькі чатыры дзейныя асобы: Трышчан, Іжота, служка Брагіня і кароль Марка, -- дзеянне ўёй развіваецца даволі дынамічна, увага гледача неадрыўна прыкавана да ўсяго таго, што адбываецца на сцэне. Трэба адзначыць і выдатную ігру артыстаў Мазырскага драматычнага тэатра, выканаўцаў роляў: Трышчана, трошкі лёгкадумнага, але мужнага і харобрага рыцара, які шчыра кахае абранніцу свайго сэрца і ў той жа час застаецца верным свайму абавязку; прыгажуні Іжоты, каханне якой да "найвялікшага рыцара ў Карнавалі" аказваецца вышэй за ўсё, нават вышэй за смерць; кемлівай і нястомнай служкі Брагіні, якая аддана служыць сваёй пані і свайму пану; і, нарэшце, разважлівага, хітрага і жорсткага караля Марка, "лепшага гульца ў Карнавалі".

Мастацкае і музычнае афармленне спектакля было цудоўным, арганічна дапаўняла дзеянні артыстаў на сцэне.

Камедыя, безумоўна, мела поспех. Сведчанне таму -- воплескі гледачоў і кветкі, што былі падараваны артыстам, як знак падзякі гасцям за тое, што прынялі ўдзел у фестывалі і прапанавалі ўвазе гамяльчан незабыўную і прыемную сустрэчу з высакародным рыцарам Трышчанам і яго каханай, чароўнай каралевай Іжотай.

**Н.ДЗЕНІСЮК,**
**студэнтка гр. БА-14**
**філалагічнага факультэта.**

# ЗНОСІНЫ БЕЗ СЛОЎ АБО Я ЧЫТАЮ ВАШЫЯ ДУМКІ

Біблейская выснова сцвярджае: няма нічога тайнага, што не стала б наяўным. Як часта мы саманадзейна думаем, што нашыя нявыказаныя славесна думкі застаюцца недаступнымі для іншых. На самой справе гэта далёка не так. Упэўніць вас у тым, што мова жэстаў, міміка твару, рух рук і тулава іншы раз лепш выказваюць вашы сапраўдныя думкі і пачуцці, чым ваша мова, мне дапаможа сусветна прызнаны знаўца псіхалогіі чалавечых зносін з Аўстраліі Алан Піз. Ён -- аўтар шэрагу бліскучых кніг, сярод якіх найбольш вядомая яго работа "Мова целарухаў".

Алан Піз прыводзіць дзіўныя лічбы. Пры зносінах усяго толькі 7% інфармацыі перадаецца непасрэдна за лік слоў, 38% -- за лік гукавых сродкаў (тон і інтанацыя мовы, яе гучнасць). Пры дапамозе іншых сродкаў перадаецца 55% інфармацыі. Гэта -- міміка, жэсты, міжвольныя рухі і г.д.

Чалавек выйшаў з жывёльнага свету. Але ў адрозненні ад жывёл ён валодае мовай. Жывёлы таксама размаўляюць, але яны выкарыстоўваюць мову целарухаў, поз больш шырока, чым гукавыя сігналы. Усё гэта азначае, што для чалавека гэты канал перадачы інфармацыі перастаў адыгрываць сваю ролю.

Рэдка якому мужу ўдаецца падмануць сваю жонку. Большасць жанчын могуць даведацца аб гэтым па вачах мужчыны. Можа таму вінаваты муж, які не страціў сумлення, адводзіць вочы ў бок? Дарэчы сказаць, выказванне "схлусіць не міргнуўшы вокам" адносіцца да асабліва ўмелых ілгуноў. З імі можна сутыкнуцца і ў службовых кабінетах. У такім выпадку ўзнікае пытанне -- ці можна падрабіць мову целарухаў? Так, можна, і ўладальнікі службовых кабінетаў гэтым шырока карыстаюцца. Калі хітры століначальнік добразычліва пачне вам тлумачыць, што вашу просьбу задаволіць нельга, або, калі ён, гледзячы вам у вочы, упэўнена паабяцае вырашыць усе вашы праблемы і назаве канкрэтны тэрмін, не вельмі давярайце сваім вушам.

Прытворства і падман, разыходжанне слоў і думак не праходзіць бясследна для падманшчыка. Мікрасігналы, якія ідуць ад арганізма, выдадуць яго патаемныя думкі. Гэта могуць быць звужаныя зрачкі, прыўзнятае брыво, скрыўленыя вуглы роту, рука, быццам выпадкова паднесеная да носу і г.д. Не прапусціце такіх, здавалася б, зусім дробных дэталяў.

На шчасце, мы маем зносіны большай часткай не з бюракратамі, якія дасягнулі поспехаў у прытворстве, а са звычайнымі нармальнымі людзьмі, але і ў гэтым выпадку авалоданне мовай жэстаў дазваляе чалавеку больш утульна адчуваць сябе і ў акружэнні сяброў, і сярод незнаёмых людзей, робіць яго больш прыцягальным. Якая галоўная ваша задача ў гэтым выпадку? Яна заключаецца ў тым, каб быць правільна зразумелым і правільна разумець іншых.

У рэшце рэшт, разам з Аланам Пізам мы адпраўляемся ў падарожжа па дзіўнай краіне Нямоўных Зносін. Першы прыпынак на нашым шляху -- станцыя Рукапацісканне.

Абмен рукапацісканнем -- старажытны рытуальны жэст. З даўніх часоў адкрытая далонь азначала шчырасць, чэснасць, адданасць, давер. Не выпадкова клятву даюць звычайна з далонню на сэрцы. Прысягу ў судзе многіх краінах даюць узняўшы руку з адкрытай далонню. Руку дапамогі прапануюць сябру, руку і сэрца -- любімаму чалавеку.

У часы сярэдневяковя закаваныя ў браню рыцары для прымірэння з ворагам здымалі металічную пальчатку. З тых часоў рукапацісканне ў пальчатцы немагчыма.

З часам старажытны жэст рукапацiскання істотна змяніўся і наўрад ці мы зараз надаем яму асаблівае значэнне. Між тым, рукапацісканне бывае розным. Праз яго ўскосна перадаецца інфармацыя аб азначаных тыпах узаемаадносін паміж людзьмі, якія вітаюць адзін аднаго. У час моцнага рукапацiскання чалавек, які лічыць сябе гаспадаром становішча, інстынктыўна пастараецца падаць руку першым і захапіць вашу руку быццам бы зверху. Калі вы пакідаеце сваю руку ў такім становішчы, вы тым самым даеце ведаць партнёру, што прымаеце яго вядучае становішча і займаеце падпарадкаваную пазіцыю.

Калі вітаюцца два ўладныя чалавекі, той, чыю далонь узялі зверху, паспрабуе зрабіць усё, каб далоні прынялі вертыкальнае палажэнне. Асабліва нетактоўным начальніцкім жэстам з"яўляецца нядбайна працягнутая для рукапацiскання паралельна падлозе далонь з адтапыранымі пальцамі. Існуе некалькі спосабаў нейтралізацыі такога "уладнага" рукапацiскання. Найбольш радыкальны -- адмовіцца ад рукапацiскання. Але нічога не даказвае той, хто даказвае груба. Лепш за ўсё абхапіць сваёй рукой начальніцкую руку за запясце. У выхаваўчым эфекце можна не сумнявацца.

Спадзяюся, што цяпер вы і самі зможаце прывесці масу цікавых прыкладаў рукапацісканняў. Нагадайце, якую школу мімікі і жэстаў мы прайшлі ў нядаўнія часы. Абвешаны зоркамі генеральны лідэр краіны стрымана вітаўся з прадстаўнікамі недружалюбных капіталістычных краін. З лідэрамі дружалюбна настроеных капіталістычных краін рукапацісканне было больш доўгім і суправаджалася трасеннем рукі партнёра.

З кіраўнікамі развіваючыхся краін віталіся, заключаючы руку субяседніка ў "пальчатку", г.зн. абхапіўшы яе дзвюма рукамі.

Лідэраў былых сацыялістычных краін пры рукапацiсканні бралі за локаць або за плячо левай рукой, лёгка абдымалі і пахлопвалі па плячы. І толькі з некаторымі, асабліва блізкімі і вернымі сябрамі, моцна абдымаліся і трохразова цалаваліся па-руску.

Прыведзены прыклад дазволіў мне коратка перадаць вам тое, што ў тлумачэнні Алана Піза займае намнога больш месца. Ва ўсялікім выпадку, давайце не будзем лёгкадумна адносіцца да рукапацiскання -- гэтаму пачатковаму пункту зносін і знаёмства. Аднак, калі бацька, які вучыць сына моцнаму рукапацісканню, гаворыць: "Давай павітаемся як мужчына з мужчынай", няхай растлумачыць, што слабае рукапацісканне далёка не заўсёды з"яўляецца прыкметай бязволля і слабасці. Чалавек можа быць хворы артрытам. Інстынктыўна захавае сваю руку ад моцнага рукапацiскання музыкант і хірург. Псіхалогія зносін -- гэта не арыфметыка, а хутчэй вышэйшая матэматыка. Будзем пра гэта памятаць.

**А.РЫЧКОЎ,**
**ст. выкладчык кафедры палітычнай сацыялогіі, кандыдат сацыялагічных навук.**



ГЛАЗАМИ ЗАРУБЕЖНЫХ СТУДЕНТОВ

# ГОРОД СВЯТОГО ПЕТРА

7 мая был для нас значительным днём -- мы выехали на автобусе из Гомеля в Санкт-Петербург, который давно мечтали увидеть.

Приехали в Санкт-Петербург с музыкой и смехом, очень привлекал ночной вид этого города.

Нам повезло, потому что мы нашли гостиницу, расположенную на центральной улице -- Невском проспекте. Именно здесь находится много памятников старины.

Сначала мы пришли в Казанский собор. Это здание музея истории религии и атеизма. Оно построено в греческом стиле. Наши преподаватели Т.Е. Шевченко, О.П. Косинова, Н.А. Дзвинковская, с которыми мы приехали, рассказали об интересной истории этого собора. Мы увидели два памятника. Один -- Кутузову, другой -- Барклаю де Толли.

На площади напротив мы сразу увидели собор, который называется "Спас на крови", и другой собор -- Исакиевский. Это самое знаменитое и самое высокое здание. Его высота 101 метр. Мы поднялись наверх и увидели панораму города.

Недалеко от этого собора стоит памятник Петру I. Великий Пушкин назвал его "Медным всадником", его вес -- 20 тонн. Петр верхом на коне устремляется вперед, что свидетельствует о героическом пафосе монумента.

Ещё мы увидели другие памятники -- Пушкину, Ленину, Екатерине II и Александру II, а также известным учёным.

На теплоходе мы плавали вдоль набережной реки Невы. На берегу стоит очень много зданий. Мы заметили: ни одно из них не похоже на другое. Их построили в разных европейских стилях.

Санкт-Петербург -- это город мостов. Их здесь почти 300. У многих мостов есть особенности: ночью в два часа они открываются, а утром в пять часов закрываются. Нам удалось увидеть Дворцовый мост, Банковский мост, мост Ломоносова.

Корабль остановился на берегу около Зимнего дворца. Мы удивились тому, что это здание очень величественное, внушительное. Мы вошли в Эрмитаж. Это 3-этажное здание. На первом этаже показаны первобытная культура, культура и искусство античного мира, Золотая кладовая. На втором этаже -- западноевропейское искусство. Здесь можно увидеть картины, принадлежащие кисти известнейших художников мира. На третьем этаже представлено искусство и культура Востока. Здесь много китайских произведений, например: картинки, фарфор, монеты, драгоценные камни. Мы гордимся нашей страной.

Мы растроганно вздыхали о летнем дворце -- это сверкающее золотом и яшмой здание. К сожалению, фонтаны не работали и мы не смогли полюбоваться их красотой.

В третий туристический день был самый большой и великий праздник -- День Победы. Нам выпала честь тоже в нём участвовать. Мы стояли на Дворцовой площади, любовались видом салютов, радовались вместе с русским народом.

Перед отъездом мы прогулялись по Невскому и Московскому проспектам. В магазинах увидели множество прекрасных самоцветов, которые ласкают взор.

Мы очень полюбили Санкт-Петербург и будем любить этот город всегда. Мы поклялись вернуться сюда ещё раз.

**Чжан Жун Жун,**
**Ван Цзюнь,**
**студентки II курса экономического факультета.**

ЛІДЭР

# ВЯРТАННЕ ПРАЗ ДВА ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ



Ні для каго не сакрэт, што мода на музыку (як, наогул, і на ўсё іншае) перыядычна вяртаецца. І калі сярэдзіна 80-х характарызавалася павышанай цікавасцю да куміраў 60-х гадоў Э.Прэслі, Ч.Беры, Р.Орбісону, "Бітлз" і "Ролінг Стоунз", то сёння ў модзе настальгічныя мелодыі канца 70-х -- пачатку 80-х гадоў. Да нас вяртаюцца "АВВА", "Боні М", "Чынгіз-Хан", Дэміс Русас, "Світ" і, канешне ж, група "Смокі". Аб ёй і пойдзе размова.

Група была створана ў Англіі ў 1974 годзе. Крыс Норман, Тэры Атлі, Алан Сілсан і Піт Спэнсэр свой першы дыск выпусцілі ў 1975 годзе пад назвай "Обойди". Найбольш прафесійным з удзельнікаў таго часу быў барабаншчык Піт Спэнсэр. Менавіта яму і належыць заслуга ў тым, што ў час выступлення ў клубе Хэтчэт на групу звярнулі ўвагу Майк Чэпмен і Нікі Чын, якія паспрыялі падпісанню кантракта з фірмай "РЭК". Менавіта дуэт Чын-Чэпмен і з"яўляецца аўтарам большасці хітоў, такіх як "Живя по соседству с Алисой", "Постоянно меняясь", "Не играй мне твой рок-н-рол" і супер-хіта "Я встречу тебя в полночь". Вынікам супрацоўніцтва стаў дуэт К.Нормана і Сюзі Куатро, запісаўшых разам некалькі песень. Альбомы "Смокі" "Полночное кафе", "Горящие огни и темные аллеи", "Маленькие преступники" і "Вторая сторона дороги" -- гэта быў поспех музыкі простай, меладычна бездакорнай, стылёва аранжыраванай і цудоўна запісанай. І хаця нічога новага ў поп-музыку група не прынесла, радыёстанцыі па абодва бакі акіяна перадавалі песні "Смокі" на працягу многіх гадоў...

Іспыт славай падштурхнуў вакаліста Крыса Нормана пайсці з групы і пачаць сольную кар"еру, прычым дастаткова ўдалую. Апошні альбом спевака "Размышления" пацвердзіў той факт, што Норман па-ранейшаму працуе ў тым жа стылі, які прынёс славу 20 гадоў назад групе "Смокі". Сама ж група "Смокі" без Нормана змяніла некалькі вакалістаў, лепшым з якіх быў, на мой погляд, Ол Бартан, чый стылёвы сіплаваты голас нават больш моцны, чым у Нормана. Апошні рэліз групы -- кампакт 1995 года з новымі версіямі старых хітоў, запісаных з Лонданскім сімфанічным аркестрам. Ён выпушчаны фірмай ЕМІ невялікім тыражом і імгненна быў раскуплены аматарамі меладычнага поп-жанру...

І хаця прайшло больш 20 гадоў з моманту заснавання групы "Смокі", іх старыя песні гучаць і сёння цудоўна, арыгінальна і свежа...

Паслухайце, і Вы ўпэўніцеся ў гэтым самі...

**П.БЕСЯЦКІ,**
**вядучы рубрыкі "Лідэр".**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

**аб"яўляе прыём у аспірантуру ў 1996 годзе па спецыяльнасцях:**

***з адрывам ад вытворчасці***

матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; тэорыя неімавернасцей і матэматычная статыстыка; механіка дэфармуемага цвёрдага цела; тэарэтычная фізіка; оптыка; фізіка ядра і элементарных часціц; аналітычная хімія; батаніка; гідрагеалогія; геафізічныя метады пошукаў і разведкі месцанараджэнняў карысных выкапняў; вылічальныя машыны, комплексы, сістэмы і сеткі; прымяненне вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання і матэматычных метадаў у навуковых даследаваннях; палітычная эканомія; эканоміка, планаванне, арганізацыя кіравання народнай гаспадаркай і яе галінамі; літаратура народаў Расіі (XX стагоддзе); беларуская літаратура; беларуская мова; тэорыя і гісторыя педагогікі;

***без адрыву ад вытворчасці***

аналітычная хімія; батаніка; заалогія; генетыка; геафізічныя метады пошукаў і разведкі месцанараджэнняў карысных выкапняў; прымяненне вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання і матэматычных метадаў у навуковых даследаваннях; палітычная эканомія; беларуская мова; тэорыя і гісторыя педагогікі.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб"ёме дзейнічаючай праграмы для ВНУ.

Прыём дакументаў і субяседаванне з загадчыкамі кафедр або мяркуемымі навуковымі кіраўнікамі да 10 верасня 1996 года.

Заява аб прыёме ў аспірантуру падаецца на імя рэктара з дадаткам: асабістага лістка па ўліку кадраў з 3-мя фатакарткамі; аўтабіяграфіі; характарыстыкі-рэкамендацыі з апошняга месца працы; копіі дыплома аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і копіі выпіскі з заліковай ведамасці; спісу навуковых прац, вынаходніцтваў і справаздач аб навукова-даследчай рабоце, а пры іх адсутнасці -- рэферата па выбранай навуковай спецыяльнасці; выпіскі з пратакола пасяджэння вучонага савета для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру вучонымі саветамі ВНУ (факультэтаў) непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы; пасведчання па форме 2.2 аб здачы кандыдацкіх экзаменаў для асоб, поўнасцю або часткова здаўшых кандыдацкія экзамены; меддаведкі (форма №086-у); выпіскі з працоўнай кніжкі.

Уступныя экзамены праводзяцца з I па 30 кастрычніка 1996 года.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104, аддзел аспірантуры. Тэл. 56-21-29.

**РЭКТАРАТ.**

⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘⌘

## *У нас у гасцях гумарыстычная газета "Пикник"*

***Паважаныя чытачы! Вы можаце ўключыцца ў конкурс малюнкаў на лепшую карыкатуру або тэм для карыкатур, якія праводзіцца вясёлай газетай "Пикник" (дадатак да "Детективной газеты"). Яны будуць апублікаваны як у нашай універсітэцкай газеце, так і ў названым выданні.***

***Тыя, хто ў наш цяжкі час не страцілі пачуцця гумару, спрабуйце свае сілы!***

***Малюнкі можна прыносіць у рэдакцыю "Гомельскага універсітэта" (галоўны корпус, п. 1-18, тэл. 57-43-21).***









Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, калектыў кафедры рускага, агульнага і славянскага моваазнаўства выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту названай кафедры **КОБЫШ** Іне Іванаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Калектывы эканамічнага факультэта і факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў выказваюць глыбокае спачуванне метадысту **ДЗЕГЦЯРОВАЙ** Але Яўгенаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфвыдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 309.
Падпісана да друку 7.06.96.